# СВЯТА ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Якія яны, першакурснікі нашай альма-матар? Таленавітыя, крэатыўныя, ініцыятыўныя, вясёлыя – адным словам, самыя лепшыя! У гэтым змаглі ўпэўніцца тыя, хто прыйшоў падтрымаць ці проста паглядзець агульнаўніверсітэцкі конкурс першакурснікаў «Курс маладога студэнта», што праходзіў у межах міжнароднага студэнцкага фестывалю «Арт-восень ВДУ – 2017». У першы конкурсны дзень свае візітоўкі прадставілі гістарычны, мастацка-графічны, юрыдычны і педагагічны факультэты.



Студэнты-гісторыкі за аснову свайго выступлення ўзялі старажытнагрэчаскі міф пра Геракла і паставілі перад сабой задачу выратаваць родны факультэт, што знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Гэтую высакародную місію хлопцы і дзяўчаты выканалі паспяхова.

Першакурснікі мастацка-графічнага факультэта прыйшлі да высновы, што не важна, хто ты: філолаг, педагог ці дызайнер. Поспеху можа дасягнуць кожны. А галоўнымі героямі іх візітоўкі сталі муж і жонка, якія ўспаміналі свае яркія, вясёлыя студэнцкія гады.

Будучыя юрысты паспрабавалі прасачыць, як мяняюцца студэнты на працягу чатырох гадоў вучобы ва ўніверсітэце. Для гэтага яны адправіліся ў падарожжа на самалёце «ВДУ-Airlines».

У неверагодныя магчымасці сапраўднага мастацтва вераць хлопцы і дзяўчаты педагагічнага факультэта, якіх непакоіць стан сучаснай культуры. На іх думку, сёння адбываецца дэградацыя маладога пакалення, бо папулярныя мемы і відза не нясуць у сабе ніякага сэнсу і эстэтычнай прыгажосці. Але студэнты вераць, што ўсё зменіцца да лепшага.

Прыемным сюрпрызам для ўсіх у першы конкурсны дзень стала выступленне інструментальнага ансамбля «Ч.Т.О.» (кіраўнік – студэнт ПФ Сяргей Кухарэнка). Музыкі разам з гледачамі праспявалі хіты і прадэманстравалі цудоўную ігру на музычных інструментах.

На другі дзень свае конкурсныя праграмы прадставілі першакурснікі факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі, факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій, факультэта фізічнай культуры і спорту, біялагічнага і філалагічнага факультэтаў.

Дзе, як не на факультэце сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі, ведаюць, як «пракачаць» звычайнага хлопца. Але гэта не так проста, бо герою неабходна было прайсці праз школы акцёрскага, харэаграфічнага і музычнага майстэрства, а таксама атрымаць карысныя парады ад майстра пікапа Юрыя. «Калі ў цябе ёсць мэта, то трэба прыкласці ўсе намаганні, каб яе дасягнуць», – упэўнены студэнты ФСПіП.

Першакурснікі факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій закранулі праблему сучаснай моладзі, якая большую частку жыцця праводзіць у навушніках і мае пэўныя цяжкасці ў зносінах з аднагодкамі. Музыка, канешне, натхняе і дапамагае ў цяжкія хвіліны, але ці варта замяняць ёй сяброў і свядома адмаўляцца ад стасункаў з іншымі людзьмі?

Студэнты якога факультэта больш за ўсё нагадваюць супергерояў? Няхай не крыўдуюць хлопцы і дзяўчаты іншых факультэтаў, але толькі на факультэце фізічнай культуры і спорту супергероем можа стаць кожны першакурснік. У гэтым можна было ўпэўніцца падчас візітоўкі: на дапамогу студэнтам прыйшоў галоўны герой папулярнага серыяла «Фізрук».

Біёлагі шукалі творчыя ідэі ў студэнцкай сталоўцы, дзе пакаштавалі незвычайны суп, а таксама ў кафэ «Хутарок», дзе не толькі прадэгуставалі смажаную бульбу, але і пабачылі беларускі народны танец. Акрамя гэтага, першакурснікі паказалі ўсім прысутным відэаролік «Пяць крокаў да поспеху». Такім чынам яны выказалі думку пра тое, што ідэі для творчасці можна знайсці паўсюль.

Апошнімі выступілі прадстаўнікі філалагічнага факультэта. Самым кранальным нумарам іх візітоўкі стала літаратурна-музычная кампазіцыя ў выкананні студэнтак Алесі Мажэйка і Яны Налівайка. Алеся чытала вершы беларускіх і рускіх паэтаў, а Яна іграла на флейце.

Дзякуй першакурснікам за пазітыў і крэатыў, дзякуй старшакурснікам за дапамогу ў падрыхтоўцы візітовак, дзякуй усім хлопцам і дзяўчатам, якія прыйшлі падтрымаць свае факультэты. Студэнты ВДУ, вы – лепшыя!

**Настасся КІСЯЛЁВА, Вікторыя ГІР'ЯТОВІЧ, студэнткі 3 курса ФлФ.**

**На здымках:** падчас выступлення першакурснікаў.

**Фота В. ЛУЗГІНОЙ.**

